**Чарняўская, В.** Памяць застаецца, а жыццё працягваецца... / В. Чарняўская // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). – 2018. – 14 лют. – С. 1—2.

# ПАМЯЦЬ ЗАСТАЕЦЦА, А ЖЫЦЦЁ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

*Боль неаб'яўленай вайны ў Афганістане, яе драма, што захапіла лёсы цэлага пакалення, у наш час прываблiваюць увагу гiсторыкаў, палiтолагаў, кiнарэжысёраў, якiя iмкнуцца зразумець сэнс той вайны. Яе асаблiвасць заключалася ў тым, што большая частка насельнiцтва былой савецкай краiны жыла ў мiры, працавала, вучылася, весялiлася, у той час як асобная яе частка – яшчэ зусiм. маладыя салдаты – iшлi пад кулi... Але пра гэта гаварыць у той час было забаронена. Служба ў Афганiстане пакiнула глыбокi след у жыццi кожнага воiна-iнтэрнацыяналiста, незалежна ад таго, знаходзiўся там чалавек тыдзень, год цi нават больш. I гэты асаблiвы перыяд нiколi не сатрэцца з памяцi i многiх нашых землякоў, сярод якiх шаркаўчанiн Аляксандр Уладзiмiравiч Асiпенка.*



Яго тэрмiновая ваенная служба спачатку праходзiла ў Ленiнградзе, потым у Выбаргу. У Афганiстан 20-гадовы юнак трапiў у студзенi 1980 года. Разам з iншымi сваiмi саслужыўцамi спачатку быў накiраваны ў Герат – горад на паўночным захадзе Афганiстана, а потым да самага звальнення ў запас служыў на поўднi – у Кандагары. Быў камандзiрам баявой разведвальнай машыны, суправаджаў грузы i пры гэтым забяспечваў ахову боепрыпасаў для падраздзяленняў у месцы правядзення баявых аперацый. Абараняць грузы даводзiлася не раз. Здаралася i так, што iх БТР (бранiраваная транспартна-баявая машына) трапляла на мiны i ёй адрывала колы. Экiпаж, на шчасце, абыходзiўся без страт. Дадому праз год пасля службы ў Афганiстане Аляксандр вярнуўся ў званнi «старшы сяржант». Напрыканцы службы за сваю дзейнасць па суправаджэннi грузаў быў прадстаўлены да ўзнагароды, але, як i многiя ў той час, паехаў дадому i не паспеў яе атрымаць.

Аляксандр вярнуўся ў Шаркаўшчыну, дзе пражывалi яго родныя, у хуткiм часе стварыў сваю сям'ю. На працягу 15 гадоў працаваў у мелiярацыi, апошнiя 22 гады з'яўляецца вартаўнiком у службе аховы нашага гарадскога пасёлка. У ветэрана афганскай вайны ўжо двое дарослых дзяцей, 4 унукi. Жыццё, як кажуць, працягваецца, а памяць застаецца. Пра тое, што перажыў на той вайне, Аляксандр Уладзiмiравiч, як i большасць воiнаў-афганцаў, успамiнаць не любiць. А вось пра сваiх саслужыўцаў i баявых сяброў расказвае з асаблiвай цеплынёй i настальгiяй, як пра родных людзей:

– Многае давялося ўбачыць на той вайне i перажыць разам. Таму i сёння, праз трыццаць сем гадоў пасля службы, стараемся не парываць сувязi, iмкнёмся часцей сустракацца. У мiнулым годзе знайшоў сябра, з якiм разам былi на той вайне i з таго часу не разу не бачылiся. Ездзiў да яго на машыне ў Оршу. Радасць ад той сустрэчы словамi не перадаць. Адносiны тых, хто калiсьцi прайшоў Афган, невыпадкова называюць «баявым братэрствам», таму што, як i там, у гарачых пясках, мы i дома працягваем падтрымлiваць адзiн аднаго. Вайна аб'ядноўвае, прымушае стаяць за таварыша да апошняга, падтрымлiваць у цяжкую хвiлiну. Таму i 15 лютага дата для нас асаблiвая.

*Вольга* ***ЧАРНЯЎСКАЯ***